# З АДНАГО ДРЭВА

## Творчыя плады жодзінцаў



*Уладзімір Гладкевіч «П'ета».*

Пра Жодзіна заўсёды кажуць у кантэксце горада буйных заводаў і вялікіх машын, але ж гэты жывапісны куток краіны багаты і на творчых асоб. Доказам таму — гучныя імёны мастакоў, якія на гэтым тыдні прадставілі вялікую выстаўку «Арт-Жодзіна» ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры».

У экспазіцыі прадстаўлена каля ста работ амаль трох дзясяткаў майстроў, якіх аб'ядноўвае месца, дзе яны жывуць і працуюць.

— Пейзажы адлюстроўваюць прыгажосць горада, які, дарэчы, у 2018 годзе адзначыў сваё 55-годдзе, — заўважае дырэктар Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Марына Татарэвіч. — Нягледзячы на маладым ўзрост, у Жодзіне жыве шмат знакамітых мастакоў, вядомых не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

Стылістычна майстры выказваюць сябе ў вельмі шырокім і рознатэматычным дыяпазоне. Напрыклад, Алег Васько і Святлана Навіцкая выбіраюць рэалізм, Аляксею Марачкіну бліжэй арнаментальнасць і стылізацыя, Канстанціна Андруковіча цікавяць абстрактныя формы…

На станаўленне прадстаўленай мастацкай супольнасці адмысловы ўплыў аказалі студыі Анатоля Шыбікіна і Аляксандра Казарэза, якія працавалі ў горадзе з 1970-х гадоў. Акрамя таго, значнай падзеяй для мастакоў стала рэспубліканская мастацкая выстаўка, якая праходзіла ў Мінску ў 2008 годзе. На аснове яе матэрыялаў быў выпушчаны каталог «Жодзінцы». Праз больш чым 10 гадоў для публікі зноў прадстаўлена экспазіцыя, якая адлюстроўвае асаблівасці мастацкага майстэрства жодзінскіх аўтараў, іх стылістычныя, кампазіцыйныя і каларыстычныя пошукі.

**Вікторыя АСКЕРА,**
**фота аўтара**



*Работа Юліі Пухляковай.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ